# Жыццё цудоўнае і трагічнае
## (Да 125-годдзя з дня нараджэння акадэміка У.М.Ігнатоўскага)



Калі чалавек па сваёй волі сыходзіць з жыцця, сведак гэтага звычайна не бывае. Ніколі не даведаешся, пра што ён думаў і што адчуваў у апошняе сваё імгненне... Калі толькі не раскажа што-небудзь хаця б кароценькая запіска з некалькімі словамі, накіданымі паспешліва, або прадуманы да дэталей ліст, напісаны цвёрдым почыркам. Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі ні запіскі, ні ліста не пакінуў. І выстрал, што прагучаў 4 лютага 1931 г., аддаўся глыбокім болем у душах мноства людзей, якія любілі яго.

Усевалад Ігнатоўскі нарадзіўся 19 красавіка 1881 г. у вёсцы Токары Брэсцкага ўезда Гродзенскай губерні (цяпер Камянецкі раён Брэсцкай вобласці). Бацька яго быў вясковым настаўнікам, потым – свяшчэннікам.

У 1896 годзе Усевалад паступае ў Віленскую духоўную семінарыю, адкуль неўзабаве быў выключаны за ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях, і завяршае вучобу ў Магілёўскай духоўнай семінарыі. У 1902 годзе, паспяхова здаўшы ўступныя іспыты па рускай, лацінскай і грэчаскай мовах, Ігнатоўскі быў прыняты ў Пецярбургскі гісторыка-філалагічны інстытут. Тут у асяроддзі разначыннага, рэвалюцыйна настроенага студэнцтва Усевалад вызначае свой палітычны выбар, далучыўшыся да партыі эсэраў.

Паражэнне Расіі ў вайне з Японіяй, узрастанне рэвалюцыйнага руху пакінулі глыбокі след у душы маладога чалавека. Ён актыўна ўдзельнічае ў антыўрадавай студэнцкай забастоўцы. «Глыбока ўзрушаныя падзеямі апошніх дзён, што адбыліся ў Пецярбургу і іншых месцах Расіі, мы, студэнты гісторыка-філалагічнага інстытута, не можам прадаўжаць заняткі і просім спыніць часова чытанне лекцый, пакуль агульнае акадэмічнае жыццё не ўвойдзе ў нармальную каляіну» – такую рэзалюцыю прыняла студэнцкая сходка 23 студзеня 1905 г. У час забастоўкі першакурснікі перад пагрозай выключэння былі вымушаны выйсці на заняткі, а іншыя студэнты вырашылі трымацца да апошняга. «Кругавой зарукай абавязваемся неадкладна пакінуць інстытут, калі хто-небудзь з нашых таварышаў будзе звольнены». Пад гэтай студэнцкай рэзалюцыяй падпісаўся і трэцякурснік Ігнатоўскі.

У 1906–1907 гадах Усевалад Ігнатоўскі здае іспыты на званне настаўніка і едзе працаваць у Аланецкую губерню. Ён шмат чытае, паглыбляе свае веды па гісторыі Айчыны.

З 1909 года Ігнатоўскі прадаўжае вучобу ў Юр'еўскім (Дэрпцкім) універсітэце, які скончыў праз два гады, вытрымаўшы, як ска-

зана ў яго асабовай справе, «...канчатковыя іспыты па гістарычным аддзяленні гісторыка-філалагічнага факультэта са званнем праўдзейнага студэнта гісторыі». У заліковай кніжцы будучага вучонага за III–V курсы па ўсіх прадметах, акрамя нямецкай мовы, стаіць «выдатна». Ва універсітэце Ігнатоўскі прайшоў добрую гістарычную школу, з некаторымі сваімі выкладчыкамі і аднакурснікамі падтрымліваў сувязь і пасля.

У 1911 годзе Усевалад Макаравіч настаўнічаў у Віленскай прыватнай гімназіі. З 1915 года ён выкладчык, а затым – старшыня педагагічнага савета Мінскага настаўніцкага інстытута, у складзе якога эвакуіраваўся ў г.Яраслаўль. Нягледзячы на цяжкасці ваеннага часу, будучы вучоны прадаўжае даследаваць гісторыю і культуру роднага краю. Чытае курс гісторыі Беларусі ў педагагічным інстытуце, адначасова піша лецыі па гісторыі нацыянальнага руху. Застаючыся на платформе левых эсэраў, У.М.Ігнатоўскі прымае ўдзел у рабочых і салдацкіх дэманстрацыях супраць царызму, ва ўстанаўленні Савецкай улады ў Яраслаўлі. Але ўсе яго думкі былі пра родную Беларусь, пра адраджэнне свайго краю, беларускай нацыі.

Летам 1918 года Усевалад Макаравіч вяртаецца з калектывам у яшчэ акупіраваны немцамі Мінск. Стаўшы дырэктарам Мінскага педагагічнага інстытута, У.М.Ігнатоўскі за кароткі тэрмін наладзіў працу, узмацніў выкладчыцкі састаў новымі, галоўным чынам мясцовымі, сіламі. Павялічылася колькасць студэнтаў, іх рады папоўніліся прадстаўнікамі рабочай і сялянскай моладзі.

Востра адчуваючы пульс жыцця, У.М.Ігнатоўскі актыўна ўключаецца ў палітычную дзейнасць, усталёўвае кантакты з Белнацкамам і беларускімі камуністычнымі секцыямі РКП(б). Маючы магутны ўплыў на студэнтаў дзякуючы сваёй эрудыцыі, шырокаму навуковаму кругагляду, ён здолеў, знаходзячыся ў падполлі, аб'яднаць тагачасныя студэнцкія маладзёжныя арганізацыі, вясковую інтэлігенцыю ў Беларускую камуністычную арганізацыю. 30 ліпеня 1920 г. Ігнатоўскі быў прыняты ў члены РКП(б). А пад Дэкларацыяй аб аб'яўленні ССРБ ад 31 ліпеня 1920 г. у ліку іншых стаіць і яго подпіс. З гэтага часу Усевалад Макаравіч – знакаміты партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР. Выкарыстоўваючы новыя магчымасці, ён настойліва разгортвае працу беларусізацыі: адраджэнне беларускай мовы, абавязковае авалоданне ёю ўсімі жыхарамі рэспублікі, вядзенне на ёй службовай дакументацыі, стварэнне навуковай тэрміналогіі, адраджэнне гісторыі і культуры, развіццё выдавецкай дзейнасці.

У.М.Ігнатоўскі актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы матэрыялаў, дакладаў, рэзалюцый і пастаноў, якія пасля ўхвалення на партыйных і савецкіх форумах станавіліся заканадаўчай асновай дзяржаўнай палітыкі. У жніўні 1920 года яго як былога эсэра, што ведаў патрэбы і запатрабаванні сялянства, прызначылі наркамам земляробства. У канцы таго самага года Ігнатоўскаму прапанавалі пасаду наркама асветы. Усевалад Макаравіч даў згоду, тым больш што такая галіна дзейнасці супала з колам яго інтарэсаў. У той час у Наркамасветы працавалі С.Некрашэвіч, М.Ільічонак, іншыя вядомыя дзеячы айчыннай навукі, у кастрычніку 1921 года сакратаром і членам калегіі быў прызначаны А.В. Баліцкі. Стварыўся калектыў аднадумцаў, якія аддавалі сілы і талент ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння беларускага народа.

Пад кіраўніцтвам У.М.Ігнатоўскага Наркамасветы шырока разгарнуў дзейнасць па беларусізацыі: у школах рэспублікі паўсюдна ўводзіцца прадмет «Беларуская мова», на курсах ажыццяўляецца перападрыхтоўка настаўнікаў. З 1921 года ствараюцца 10-месячныя настаўніцкія курсы, гадавыя дашкольныя, 9-месячныя лектарскія курсы, дзе ў першую чаргу вывучаецца беларусазнаўства. Навучанню дзяцей на беларускай мове ў значнай ступені садзейнічала і арганізацыя вышэйшых курсаў беларусазнаўства, адкуль выйшла шмат добра падрыхтаваных педагогаў. (Толькі за год праз іх прайшлі звыш 1600 чал.)

Паступова наладжвалася і выданне падручнікаў на беларускай мове, і гэта асабліва радавала наркама. Ужо ў сярэдзіне 1922 года Наркамасветы размеркаваў паміж культурна-асветніцкімі арганізацыямі звыш 150 000 беларускамоўных кніг, у тым ліку вучэбнай літаратуры. У 1924 годзе У.М.Ігнатоўскі, ацэньваючы падзеі таго часу, пісаў: «Беларусізацыя школы вялася няўхільна. Беларуская мова, як прадмет, была ўведзена ва ўсіх школах, і каля 20% усіх школ перавялі навучанне на беларускую мову. Тое самае было зроб-

лена і ў дзіцячых установах (сады, дамы), якія ўкамплектаваны дзецьмі-беларусамі. Пры скарачэнні штатаў і пры новых назначэннях у беларускіх школах Сацвых (аддзел сацыяльнага выхавання) кіраваўся тым, ведае ці не ведае настаўнік беларускую мову, што значна сказалася на складзе настаўнікаў». «Беларускаму аддзелу і яго пададдзелам прыйшлося весці барацьбу з русіфікаванай інтэлігенцыяй, якая рабіла апазіцыю проці маладой беларускай, пралятарска-сялянскай культуры...» (Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924).

У лістападзе 1924 года ЦК КП(б) Беларусі прыняў спецыяльную пастанову аб святкаванні 20-ай гадавіны рэвалюцыйнай і 15-годдзя культурна-педагагічнай дзейнасці прафесара У.М.Ігнатоўскага. Абвестка пра гэта з'явілася ў 4-ым нумары часопіса «Полымя» за 1924 год у раздзеле «Хроніка беларускай культуры». Да юбілею планавалася выдаць кнігу з партрэтам вучонага, а Інбелкульту даручалася арганізацыя вечарыны, якая адбылася 31 снежня 1924 г. У тым самым нумары часопіса "Полымя" былі апублікаваны верш Янкі Купалы "Наш летапісец" і артыкул «Этапы рэвалюцыйнай дзейнасці т. У.М.Ігнатоўскага», у часопісе «Маладняк» (№ 6 за 1925 год) – артыкул З.Ф.Жылуновіча «Будаўніцтва Савецкай Беларусі і роля ў гэтым У.М.Ігнатоўскага», а таксама вершы А.Александровіча, А.Якімовіча і А.Гурло, прысвечаныя У.М.Ігнатоўскаму. Грамадскасць рэспублікі аддавала належнае яго асабістаму ўнёску ў будаўніцтва нацыянальнай культуры, навукі, асветы, які ацэньваўся як прынцыповае служэнне беларускаму народу.

Імя У.М.Ігнатоўскага – вучонага, педагога і асветніка, актыўнага праваднíка палітыкі беларусізацыі, першага наркама асветы – было шырока вядома ў БССР у 20-ыя гады. За пяць гадоў працы на пасадзе наркама асветы ён дасканала вывучыў сістэму народнай адукацыі ў рэспубліцы. Рэформа агульнаадукацыйнай школы, стварэнне і ўмацаванне ў цэнтры і на месцах дзяржаўнага апарату, які валодаў пытаннямі асветы, вырашэнне шэрага іншых задач дазволілі прыступіць да стварэння сістэмы вышэйшай адукацыі. У.Ігнатоўскі неаднаразова падкрэсліваў, наколькі важныя адкрыццё шырокага доступу ў аўдыторыі вышэйшай школы для ўсіх жадаючых вучыцца, і ў першую чаргу для рабочых, далучэнне да выкладчыцкай дзейнасці ў вышэйшай школе высокакваліфікаваных спецыялістаў, ліквідацыя ўсіх і ўсякіх штучных перашкод паміж свежымі навуковымі сіламі і кафедрай, матэрыяльнае забеспячэнне навучэнцаў з мэтай даць фактычную магчымасць пралетарыям і сялянам вучыцца ў вышэйшай школе.

Наркам асветы надаваў асаблівае значэнне навукова-арганізацыйнаму будаўніцтву, фарміраванню сеткі вышэйшых вучэбных і навуковых устаноў. Станаўленне вышэйшай і сярэдняй школы патрабавала пільнай увагі да прафесарска-выкладчыцкіх кадраў. Ядром кансалідацыі і з'яднання інтэлектуальных сіл сталі даследчыцкія інстытуты, ВНУ, камісіі, таварыствы, якія інтэнсіўна ствараліся ў 20-ыя гады. У краіне пачалося значнае пераразмеркаванне спецыялістаў у галіне навукі. Вярталіся на радзіму вядомыя вучоныя, прываблёныя адкрыццём магчымасцей свабоднага духоўнага развіцця нацыянальнай культуры. Росквіт айчыннай навукі быў у многім забяспечаны дапамогай з боку калег з Расіі, у тым ліку абменам вопытам, накіраваннем вядучых спецыялістаў для арганізацыі даследаванняў, падрыхтоўкі кадраў, чытання лекцый.

Падзеяй першаступеннай важнасці ў жыцці вучонага стала абранне яго прафесарам БДУ. Разам з актыўнымі стваральнікамі універсітэта У.І.Пічэтам, М.М.Нікольскім, С.Я. Вальфсонам, В.Н.Дзьякавым і іншымі У.М.Ігнатоўскі аддаў яго станаўленню шмат сіл, энергіі і таленту. Незвычайнасць асобы Усевалада Макаравіча адкрывалася імгненна для кожнага. Яго навуковы талент і здольнасць арыгінальна, незалежна мысліць яшчэ ў маладосці нястрымна прыцягвалі да яго. Студэнты любілі Ігнатоўскага. Ён быў блізкі для іх, просты ў адносінах, даступны. Незвычайнай папулярнасцю вызначаліся лекцыі прафесара. Іх наведвалі не толькі студэнцкая моладзь, але і мноства іншых слухачоў, сярод якіх былі рабочыя, салдаты, служачыя. Здараліся дні, калі ў невялікай аўдыторыі, акрамя 40 студэнтаў, збіраліся да 300 чалавек. Прафесар раскрываў свой прадмет – гісторыю Беларусі – з такой любоўю, захопленасцю і глыбінёй ведання, што пасля лекцыі заставалася адчуванне свята.

У другой палове 20-ых гадоў У.М.Ігнатоўскі займаўся рэфармаваннем навукі Беларусі, закладваў яе арганізацыйныя асновы. 31

студзеня 1925 г. на агульным сходзе Інбелкульта быў абраны новы састаў прэзідыума. Старшынёй яго стаў У.М.Ігнатоўскі, змяніўшы на гэтай пасадзе С.М.Некрашэвіча. З гэтага часу Усевалад Макаравіч засяродзіў сваю ўвагу на ўдасканаленні дзейнасці Інстытута беларускай культуры, накіраванай на паступовае пераўтварэнне яго ў Акадэмію навук, і ў той жа час прадаўжаў займацца даследаваннем гісторыі Беларусі.

Па ініцыятыве вучонага 14–19 лістапада 1926 г. адбылася акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу. Уся арганізацыйная дзейнасць ажыццяўлялася супрацоўнікамі інстытута. Канферэнцыя прайшла паспяхова і адыграла важную ролю ў рэалізацыі нацыянальнай палітыкі. Старшынстваваў У.М.Ігнатоўскі. Матэрыялы яго выступлення даюць нам сёння магчымасць не толькі лепш зразумець пазіцыю старшыні Інбелкульта па шматлікіх пытаннях гісторыі і культуры рэспублікі, але і атрымаць уяўленне аб тэмпах беларусізацыі.

13 кастрычніка ЦВК і СНК БССР прынялі Пастанову «Аб рэарганізацыі Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук». Для гэтага была створана ўрадавая камісія пад старшынствам сакратара ЦВК БССР А.І.Хацкевіча. 26 снежня Саўнаркам БССР заслухаў і зацвердзіў даклад камісіі аб рэарганізацыі Інбелкульта ў Акадэмію навук, а таксама аб складзе яе правадзейных членаў і Прэзідыума. Першымі акадэмікамі сталі 22 беларускія вучоныя і дзеячы культуры. Акрамя іх, правадзейнымі членамі былі абраны 9 чалавек ад АН СССР, АН УССР і іншых устаноў краіны. У састаў прэзідыума Беларускай акадэміі навук увайшлі: прэзідэнт – У.М.Ігнатоўскі, віцэ-прэзідэнты – М.І.Бялуга, С.М.Некрашэвіч, нязменны сакратар – У.У.Ластоўскі, члены прэзідыума – Б.М.Аршанскі, М.К.Малюшыцкі і А.В. Баліцкі. 1 студзеня 1929 г. у Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё Беларускай акадэміі навук (БАН), у якім удзельнічалі члены юбілейнай сесіі ЦВК БССР, дэлегацыі з Масквы, Ленінграда, Харкава, прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, прамысловых прадпрыемстваў, навуковых устаноў саюзных рэспублік. У кастрычніку гэтага ж года прэзідыум БАН прыняў рашэнне аб стварэнні Інстытута гісторыі Акадэміі навук, першым дырэктарам якога стаў У.М.Ігнатоўскі.

Пры ўсёй службовай занятасці вучоны знаходзіў час для распрацоўкі тэарэтычных праблем гістарычнай навукі. Ён з'яўляецца аўтарам болын за 30 прац па гісторыі і культуры Беларусі. У першай з іх, «Кароткім нарысе гісторыі Беларусі» (1919), ахарактарызаваны асноўныя этапы мінулага беларускага народа. Далей выйшлі з друку «Кароткі нарыс нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі» (1921), «Матывы лірыкі беларускага песняра М.Чарота» (1922), «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» (5 выданняў), «Беларусь» (4 выданні), «Гісторыя Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.» (3 выданні), «Каля магілы барацьбіта» (1927), «1863 год на Беларусі» і шэраг іншых выданняў.

Знаходзячыся ў атмасферы пастаяннай напружанай творчай дзейнасці, Усевалад Макаравіч не заўважаў (ці не хацеў заўважаць, а тым болып верыць), што навальнічныя хмары збіраюцца і над яго галавой. З другой паловы 1929 года разгарнулася ганенне на вучонага. Яго абвінавачвалі ў паходжанні з класава чужога пралетарыяту асяроддзя (сын свяшчэнніка), у тым, што ён быццам бы праводзіў у сваіх працах антыпартыйныя і антыпралетарскія ідэі, служыў шырмай для прыкрыцця варожай дзейнасці нацдэмаў у Акадэміі навук.

У студзені 1931 года У.М.Ігнатоўскага выключылі з партыі і знялі з пасады прэзідэнта АН БССР. Пачаліся допыты ў АДПУ, дзе з ім груба абыходзіліся, прымушалі падпісваць паказанні, якія не адпавядалі рэальнасці. Вучоны цяжка пакутаваў. Ён не мог спакойна глядзець на ўбоства, прафанацыю, якія запанавалі ў навуцы, на яе знішчэнне, якое ішло «ўдарнымі тэмпамі». Прадчуванне бяды не пакідала яго... і прагучаў выстрал, які спыніў жыццё Усевалада Макаравіча Ігнатоўскага.

Пахаваны вучоны-гісторык і выдатны дзяржаўны дзеяч у Мінску на вайсковых могілках. На былым будынку Інбелкульта па Рэвалюцыйнай вуліцы, дзе ён працаваў і адкуль бярэ пачатак сённяшняя Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, устаноўлена мемарыяльная дошка.

***Г.У.Карзенка,***
*загадчык аддзела сацыяльна-эканамічнай гісторыі, навукі і культуры Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук*

Пераклад на беларускую мову *А.А.Язерскай.*